КАНСТЫТУЦЫЯ (АСНОЎНЫ ЗАКОН)
САЮЗА СОВЕЦКІХ СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ РЭСПУБЛІК.

Артыкул 100. Выканаўчым і распарадчым органам сельскіх Советаў дэпутатаў працоўных у невялікіх паселішчах, у адпаведнасці з Канстытуцыямі саюзных рэспублік, з'яўляюцца старшыня, яго намеснік і сакратар, якія выбіраюцца імі.

Артыкул 101. Выканаўчыя органы Советаў дэпутатаў працоўных непасрэдна падсправаздачны як Совету дэпутатаў працоўных, які іх выбраў, так і выканаўчаму органу вышэйстаячага Совета дэпутатаў працоўных.

РАЗДЗЕЛ IX
Суд і пракуратура

Артыкул 102. Правасуддзе ў СССР ажыццяўляецца Вярхоўным Судом СССР, Вярхоўнымі Судамі саюзных рэспублік, краявымі і абласнымі судамі, судамі аўтаномных рэспублік і аўтаномных абласцей, акруговымі судамі, спецыяльнымі судамі СССР, якія ствараюцца па пастанове Вярхоўнага Совета СССР, народнымі судамі.

Артыкул 103. Разгляд спраў ва ўсіх судах ажыццяўляецца з удзелам народных засядацеляў, апрача выпадкаў, спецыяльна прадугледжаных законам.

Артыкул 104. Вярхоўны Суд СССР з'яўляецца вышэйшым судовым органам. На Вярхоўны Суд СССР ускладаецца нагляд за судовай дзейнасцю ўсіх судовых органаў СССР і саюзных рэспублік.

Артыкул 105. Вярхоўны Суд СССР і спецыяльныя суды СССР выбіраюцца Вярхоўным Советам СССР тэрмінам на пяць гадоў.

Артыкул 106. Вярхоўныя Суды саюзных рэспублік выбіраюцца Вярхоўнымі Советамі саюзных рэспублік тэрмінам на пяць гадоў.

Артыкул 107. Вярхоўныя Суды аўтаномных рэспублік выбіраюцца Вярхоўнымі Советамі аўтаномных рэспублік тэрмінам на пяць гадоў.

Артыкул 108. Краявыя і абласныя суды, суды аўтаномных абласцей, акруговыя суды выбіраюцца краявымі, абласнымі або акруговымі Советамі дэпутатаў працоўных або Советамі дэпутатаў працоўных аўтаномных абласцей тэрмінам на пяць гадоў.

Артыкул 109. Народныя суды выбіраюцца грамадзянамі раёна на аснове ўсеагульнага, прамога і роўнага выбарчага права пры тайным галасаванні — тэрмінам на тры гады.

Артыкул 110. Судавядзенне праводзіцца на мове саюзнай або аўтаномнай рэспублікі або аўтаномнай вобласці з забяспечаннем для асоб, якія не ўладаюць гэтай мовай, поўнага азнаямлення з матэрыяламі справы праз перакладчыка, а таксама права выступаць на судзе на роднай мове.

Артыкул 111. Разгляд спраў ва ўсіх судах СССР адкрыты, паколькі законам не прадугледжаны выключэнні, з забяспечаннем абвінавачваемаму права на абарону.

Артыкул 112. Судзі незалежны і падпарадкуюцца толькі закону.

Артыкул 113. Вышэйшы нагляд за дакладным выкананнем законаў усімі Народнымі Камісарыятамі і падпарадкаванымі ім установамі, роўна як паасобнымі службовымі асобамі, а таксама грамадзянамі СССР ускладаецца на Пракурора СССР.

Артыкул 114. Пракурор СССР назначаецца Вярхоўным Советам СССР тэрмінам на сем гадоў.

Артыкул 115. Рэспубліканскія, краявыя, абласныя пракуроры, а таксама пракуроры аўтаномных рэспублік і аўтаномных абласцей назначаюцца Пракурорам СССР тэрмінам на пяць гадоў.

Артыкул 116. Акруговыя раённыя і гарадскія пракуроры назначаюцца пракурорамі саюзных рэспублік з зацверджання Пракурора СССР тэрмінам на пяць гадоў.

Артыкул 117. Органы пракуратуры ажыццяўляюць свае функцыі незалежна ад якіх-бы то ні было мясцовых органаў, падпарадкуючыся толькі Пракурору СССР.

РАЗДЗЕЛ X
Асноўныя правы і абавязкі грамадзян

Артыкул 118. Грамадзяне СССР маюць права на працу, гэта значыць права на атрыманне гарантаванай работы з аплатай іх працы у адпаведнасці з яе колькасцю і якасцю.

Права на працу забяспечваецца соцыялістычнай арганізацыяй народнай гаспадаркі, няўхільным ростам прадукцыйных сіл совецкага грамадства, устараненнем магчымасці гаспадарчых крызісаў і ліквідацыяй беспрацоўя.

Артыкул 119. Грамадзяне СССР маюць права на адпачынак.

Права на адпачынак забяспечваецца скарачэннем рабочага дня для пераважнай большасці рабочых да 7 гадзін, устанаўленнем штогадовых волпускаў рабочым і служачым з захаваннем заработнай платы, прадастаўленнем для абслугоўвання працоўных шырокай сеткі санаторыяў, дамоў адпачынку, клубаў.

Артыкул 120. Грамадзяне СССР маюць права на матэрыяльнае забяспечанне ў старасці, а таксама — у выпадку хваробы і страты працаздольнасці.

Гэтае права забяспечваецца шырокім развіццём соцыяльнага страхавання рабочых і служачых за кошт дзяржавы, бясплатнай медыцынскай дапамогай працоўным, прадастаўленнем у карыстанне працоўным шырокай сеткі курортаў.

(П Р А Ц Я Г)

Артыкул 121. Грамадзяне СССР маюць права на асвету.

Гэтае права забяспечваецца ўсеагульна-абавязковай пачатковай асветай, бясплатнасцю асветы, уключаючы вышэйшую асвету, сістэмай дзяржаўных стыпендый пераважная большасць навучаючыхся ў вышэйшай школе, навучаннем у школах на роднай мове, арганізацыяй на заводах, у саўгасах, машынатрактарных станцыях і калгасах бясплатнага вытворчага, тэхнічнага і агранамічнага навучання працоўных.

Артыкул 122. Жанчыне ў СССР прадастаўляюцца роўныя правы з мужчынам ва ўсіх галінах гаспадарчага, дзяржаўнага, культурнага і грамадска-палітычнага жыцця.

Магчымасць ажыццяўлення гэтых правоў жанчын забяспечваецца прадастаўленнем жанчыне роўнага з мужчынам права на працу, аплату працы, адпачынак, соцыяльнае страхаванне і асвету, дзяржаўнай аховай інтарэсаў маці і дзіцяці, прадастаўленнем жанчыне ны пяжарнасці водпускаў з захаваннем утрымання, шырокай сеткай радзільных дамоў, дзіцячых ясляў і садоў.

Артыкул 123. Роўнаправе грамадзян СССР, незалежна ад іх нацыянальнасці і расы, ва ўсіх галінах гаспадарчага, дзяржаўнага, культурнага і грамадска-палітычнага жыцця з'яўляецца непарушным законам.

Якое-б то ні было прамое або ўскоснае абмежаванне правоў або, наадварот, устанаўленне прамых або ўскосных перавог грамадзян у залежнасці ад іх расавай і нацыянальнай прыналежнасці, роўна як усякая пропаведзь расавай або нацыянальнай выключнасці, або нянавісці і пагарды — караюцца законам.

Артыкул 124. У мэтах забяспечання за грамадзянамі свабоды сумлення царква ў СССР аддзелена ад дзяржавы і школа ад царквы. Свабода правіць рэлігійныя культы і свабода антырэлігійнай прапаганды прызнаецца за ўсімі грамадзянамі.

Артыкул 125. У адпаведнасці з інтарэсамі працоўных і ў мэтах умацавання соцыялістычнага ладу грамадзянам СССР гарантуецца законам:

а) свабода слова,

б) свабода друку,

в) свабода сходаў і мітынгаў,

г) свабода вулічных шэствіяў і дэманстрацый.

Гэтыя правы грамадзян забяспечваюцца прадастаўленнем працоўным і іх арганізацыям друкарняў, запасаў паперы, грамадскіх будынкаў, вулиц, сродкаў сувязі і іншых матэрыяльных умоў, неабходных для іх ажыццяўлення.

Артыкул 126. У адпаведнасці з інтарэсамі працоўных і ў мэтах развіцця арганізацыйнай самадзейнасці і палітычнай актыўнасці народных мас грамадзянам СССР забяспечваецца права аб'яднання ў грамадскія арганізацыі: прафесіянальныя саюзы, кааператыўныя аб'яднанні, арганізацыі моладзі, спартыўныя і абаронныя арганізацыі, культурныя, тэхнічныя і навуковыя таварыствы, а найбольш актыўныя і свядомыя грамадзяне з радоў рабочага класа і іншых слаёў працоўных яднаюцца ва Ўсесаюзную Комуністычную партыю (большэвікоў), якая з'яўляецца перадавым атрадам працоўных у іх барацьбе за ўмацаванне і развіццё соцыялістычнага ладу і прадстаўляе кіруючае ядро ўсіх арганізацый працоўных, як грамадскіх, так і дзяржаўных.

Артыкул 127. Грамадзянам СССР забяспечваецца недатыкальнасць асобы. Ніхто не можа быць падвергнуты арышту інакш як па пастанове суда або з санкцыі пракурора.

Артыкул 128. Недатыкальнасць жылля грамадзян і тайна перапіскі ахоўваюцца законам.

Артыкул 129. СССР прадастаўляе права прытулку замежным грамадзянам, якія праследуюцца за абарону інтарэсаў працоўных, або навуковую дзейнасць, або нацыянальна-вызваленчую барацьбу.

Артыкул 130. Кожны грамадзянін СССР абавязан выконваць Канстытуцыю Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, выконваць законы, захоўваць дысцыпліну працы, сумленна адносіцца да грамадскага абавязку, паважаць правілы соцыялістычнага агульна-сумеснага жыцця.

Артыкул 131. Кожны грамадзянін СССР абавязан берагчы і ўмацоўваць грамадскую, соцыялістычную ўласнасць, як свяшчэнную і недатыкальную аснову совецкага ладу, як крыніцу багацця і магутнасці радзімы, як крыніцу заможнага і культурнага жыцця ўсіх працоўных.

Асобы, якія пасягаюць на грамадскую, соцыялістычную ўласнасць, з'яўляюцца ворагамі народу.

Артыкул 132. Усеагульны вайсковы абавязак з'яўляецца законам.

Вайсковая служба ў Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі прадстаўляе пачэсны абавязак грамадзян СССР.

Артыкул 133. Абарона бацькаўшчыны ёсць свяшчэнны абавязак кожнага грамадзяніна СССР. Здрада радзіме: парушэнне прысягі, пераход на бок ворага, нанясенне шкоды ваеннай магутнасці дзяржавы, шпіянаж караюцца па ўсёй строгасці закона, як самае цяжкае злачынства.

РАЗДЗЕЛ XI
Выбарчая сістэма

Артыкул 134. Выбары дэпутатаў ва ўсе Советы дэпутатаў працоўных: Вярхоўны Совет СССР, Вярхоўныя Советы саюзных рэспублік, краявыя і абласныя Советы дэпутатаў працоўных, Вярхоўныя Советы аўтаномных рэспублік, Советы дэпутатаў працоўных аўтаномных абласцей, акруговыя, раённыя, гарадскія і сельскія (станіцы, вёскі, хутара, кішлака, аула) Советы дэпутатаў працоўных, — праводзяцца выбаршчыкамі на аснове ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні.

Артыкул 135. Выбары дэпутатаў з'яўляюцца ўсеагульнымі, усе грамадзяне СССР, дасягнуўшыя 18 год, незалежна ад расавай і нацыянальнай прыналежнасці, веравызнання, асветнага цэнзу, аседласці, соцыяльнага паходжання, маемаснага становішча і мінулай дзейнасці, маюць права прымаць удзел у выбарах дэпутатаў і быць выбранымі, за выключэннем страціўшых розум і асоб, асуджаных судом з пазбаўленнем выбарчых правоў.

Артыкул 136. Выбары дэпутатаў з'яўляюцца роўнымі: кожны грамадзянін мае адзін голас; усе грамадзяне прымаюць удзел у выбарах на роўных падставах.

Артыкул 137. Жанчыны карыстаюцца правам выбіраць і быць выбранымі роўна з мужчынамі.

Артыкул 138. Грамадзяне, якія знаходзяцца ў радах Чырвонай Арміі, карыстаюцца правам выбіраць і быць выбранымі роўна з усімі грамадзянамі.

Артыкул 139. Выбары дэпутатаў з'яўляюцца прамымі: выбары ва ўсе Советы дэпутатаў працоўных, пачынаючы ад сельскага і гарадскога Совета дэпутатаў працоўных аж да Вярхоўнага Совета СССР, праводзяцца грамадзянамі непасрэдна шляхам прамых выбараў.

Артыкул 140. Галасаванне пры выбарах дэпутатаў з'яўляецца тайным.

Артыкул 141. Кандыдаты пры выбарах выстаўляюцца па выбарчых акругах.

Права выстаўлення кандыдатаў забяспечваецца за грамадскімі арганізацыямі і таварыствамі працоўных: комуністычнымі партыйнымі арганізацыямі, прафесіянальнымі саюзамі, кааператывамі, арганізацыямі моладзі, культурнымі таварыствамі.

Артыкул 142. Кожны дэпутат абавязан рабіць справаздачу перад выбаршчыкамі аб сваёй рабоце і аб рабоце Совета дэпутатаў працоўных і можа быць у любы час адклікан па рашэнню большасці выбаршчыкаў ва ўстаноўленым законам парадку.

РАЗДЗЕЛ XII
Герб, сцяг, сталіца

Артыкул 143. Дзяржаўны герб Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік складаецца з сярпа і молата на земным шары, з выяўленым у праменнях сонца і абкружаным калоссямі, з надпісам на мовах саюзных рэспублік: «Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!». Наверсе герба ёсць пяціканцовая звязда.

Артыкул 144. Дзяржаўны сцяг Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік складаецца з чырвонага палотнішча, з выяўленнем на яго верхнім кутку каля дрэўка залатых сярпа і молата і пад імі чырвонай пяціканцовай звязды, абкружанай залатой каймой. Адносіны шырыні да даўжыні — 1:2.

Артыкул 145. Сталіцай Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік з'яўляецца горад Масква.

РАЗДЗЕЛ XIII
Парадак змены Канстытуцыі

Артыкул 146. Змена Канстытуцыі СССР праводзіцца толькі на рашэнню Вярхоўнага Совета СССР, прынятаму большасцю не менш $^2/_3$ галасоў у кожнай з яго палат.

ПРЭЗІДЫУМ НАДЗВЫЧАЙНАГА VIII З'ЕЗДА СОВЕТАЎ САЮЗА СОВЕЦКІХ СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ РЭСПУБЛІК

Н. АЙТАКОЎ.	А. МІКАЯН.
І. АКУЛАЎ.	В. МОЛАТАЎ.
А. АНДРЭЕЎ.	Г. МУСАБЕКАЎ.
Ю. АХУН-БАБАЕЎ.	Г. ОРДЖАНІКІДЗЕ.
В. БЛЮХЕР.	Г. ПЕТРОЎСКІ.
С. БУДЗЁННЫ.	П. ПОСТЫШЭЎ.
К. ВАРАШЫЛАЎ.	А. РАХІМБАЕЎ.
Н. ЕЖОЎ.	Я. РУДЗУТАК.
А. ЖДАНАЎ.	І. СТАЛІН.
Л. КАГАНОВІЧ.	Д. СУЛІМАЎ.
М. КАЛІНІН.	Н. ХРУШЧОЎ.
А. КІСЕЛЁЎ.	А. ЧАРВЯКОЎ
С. КАСІОР.	В. ЧУБАР.
М. ЛІТВІНАЎ.	Н. ШВЕРНІК.
П. ЛЮБЧЭНКА.	Р. ЗЙХЕ.

Масква. Крэмль. 5 снежня 1936 года.

Адказны рэдактар С. АДЗІНЕЦ.

Мінск, друкарня «Звязды» Тыраж 1000. Горліт № 2366